# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 1 (1231) 2 студзеня 2016 г.


# 2016 — Год культуры ў Беларусі

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 28 снежня падпісаў Указ № 522 "Аб аб'яўленні 2016 года Годам культуры"**

Як паведамляе прэс-служба Кіраўніка дзяржавы, дакумент прыняты ў мэтах аб'яднання інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Айчыны, а таксама падтрымкі творчых ініцыятыў.

Ураду краіны даручана сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2016 годзе Года культуры, які закранае ўсе сферы дзейнасці (культура вытворчасці і земляробства, культура сямейных адносін і быту, культура добраўпарадкавання населеных пунктаў). Значная ўвага будзе ўдзелена мерапрыемствам у сферы мастацкай культуры, якая з'яўляецца адным з асноўных сродкаў выхавання ў моладзі патрыятызму і павагі да Радзімы. Таксама прадугледжваецца комплекс мерапрыемстваў, звязаны са знакавымі для культуры Беларусі юбілейнымі датамі.

## #2016годкультуры

Сябры! Без прадстаўніцтва ў выглядзе сайтаў, старонак у сацыяльных сетках нельга ўявіць сучаснай установы сферы культуры. Каб быць больш заўважнымі і паяднаць намаганні на карысць Года культуры, прапануем пазначаць матэрыялы на вашых сеціўных рэсурсах хэштэгам **#2016годкультуры**. Гэта дазволіць быць больш заўважнымі для пошукавых запытаў кожнаму з вашых праектаў! З 1 студзеня 2016 года гэты хэштэг будзе суправаджаць ўсе матэрыялы газеты, што з'яўляюцца на нашых рэсурсах: **на сайце — kimpress.by**, а таксама на старонках **у сацыяльных сетках**, дзе нас можна знайсці як **kimpressby**.















# ВАКОЛ ГРАФІКІ

З 1960-х беларуская графіка, кніжная і станковая, з'яўляецца брэндам Нашых творцаў паважалі і на прасторы СССР, і за мяжой. Кнігі, афармленыя такімі майстрамі, як Арлен Кашкурэвіч, Барыс Забораў, Георгій Паплаўскі, Васіль Шаранговіч, Уладзімір Савіч і сёння прыемна трымаць у руках, разглядаць. І гэта не зважаючы на тое, што на нашых вачах за апошняе паўстагоддзе не аднойчы змяняліся эстэтычныя каноны і прыхільнасці публікі. Пра тое, што традыцыя мае працяг, сведчаць работы сённяшняй творчай моладзі — выхаванцаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якімі мы ўпрыгожылі наш каляндар на 2016 год. Падборка, вылучаная з ліку дыпломных работ выкладчыкамі кафедры графікі, ахоплівае тузін апошніх гадоў. Спадзяемся, гэтыя творы будуць ствараць вам станоўчы настрой і калі-нікалі змогуць спрыяць на тле штодзённых клопатаў думкам пра адвечнае.

С. 3 — 14











# Беларускі народны каляндар на 2016 год

**Народны каляндар — сістэма сталых ці рухомых свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў быце і фальклоры. Уяўляе пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культуры. Гэта — фальклорны каляндар: ён складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах. Утрымлівае традыцыйныя феналагічныя, метэаралагічныя, агранамічныя, астранамічныя, астралагічныя і іншыя каляндарныя веды, атрыманыя пераважна шматгадовым вопытам.**

У народным календары на 2016, высакосны, год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі і гэтак далей. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-каталікі, выдзелены курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юліянскім, календаром, што мае 13 "лішніх" дзён. Зорачкай /*/ пазначаны святы "рухомай" царкоўнай пасхаліі.

У наступным, 2017, годзе праваслаўная і каталіцкая Пасха (Вялікдзень) прыпадаюць на адзін дзень — 16 красавіка.

*Умоўныя абазначэнні:* **п.** — *панядзелак,* **а.** — *аўторак,* **с.** — *серада,* **ч.** — *чацвер,* **пт.** — *пятніца,* **сб.** — *субота,* **н.** — *нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу сонца і заходу падаюцца для Мінска.*

### Студзень

**1. пт. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе, Расія — з 1700 года.

**6. с. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. **Тры Каралі**. Каталікі праводзілі маскіраваны абрад "Тры каралі", або "Ґэроды".

**7. ч. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі…". Калядавалі. Насілі "звязду". Паказвалі батлейку. На Калядах праводзілі ігрышчы ("вадзілі казу", "жанілі Цярэшку", "пяклі ката", гулялі ў "Яшчура" і іншае).

**9. сб. Сцяпан.** "На святога Сцяпана вышэй слуга за пана".

**13. с. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** "Мароз, хадзі куццю есці".

**14. ч. Васілле. Новы год** па праваслаўным календару. "Сею, сею, пасяваю, з Новым годам вас вітаю".

**18. п. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. "Каляда ад'язджае".

**19. а. Вадохрышча (Кшчэнне).** "Святое Кшчэнне ваду ксціла…, свет ачысціла і ваду наверх пусціла", "На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама".

**20. с. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

**24. ч. Аксіння.** "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце". **Фядос.** "На Фядоса цёпла".

**25. пт. Таццяна.** Свята студэнтаў. **Павел.** "Вее вецер — будзе вайна".

**31. н. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. "Хавай нос у апанасаўскі мароз".

### Люты

**1. п. Ігнат.** "На святога Ігната зіма багата".

**2. а. Грамніцы, Стрэчанне.** "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы", "Грамніца — хлебу палавіца…".

**5. пт. Агата.** Каровіна свята. "Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты".

**6. сб. Паўзіміца Аксіння.** "На Аксінні мяце". **Дарота.** "Па Дароце высахнуць хусты на плоце".

**10. с. *Серада Папяльцовая** (пач. Вялікага посту ў каталікоў).

**11. ч. Ігнат.** "Ігнат Грамніцам рад".

**14. н. Трыфан.** "На Трыфана зорна — вясна позняя". **Валянцін.** Свята закаханых.

**15. п. Грамніцы, Стрэчанне.** "Зіма з летам сустракалася…", "На Грамніцы палавіна зіміцы".

**18. ч. Агата.** Каровіна свята.

**24. с. Улассе.** Свята жывёлы. "Аўлас на сыры лас". **Мацей.** "На Мацея дарога пацее", "На Мацея адліга — будзе мароз".

**26. пт. Фаціння.** Заступніца ад хвароб.

**29. п . *Памінальніца.** Памінальны тыдзень. Калі "вея" ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі "дзесяцінкі дзве".

Заканчэнне календара — **на старонцы 2.**


УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. /

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

*Усім супрацоўнікам галіны культуры Рэспублікі Беларусь*

Паважаныя калегі!

Дарагія сябры!

Віншую вас з Новым, 2016 годам, абвешчаным Годам культуры ў Рэспубліцы Беларусь!

Новы год — гэта заўсёды новыя ідэі, жаданні і надзеі. Хочацца пажадаць усім вам самага добрага — новых уражанняў, поспехаў і значных падзей. Год культуры — гэта наш з вамі год, калі ў галіны ўжо ёсць пэўныя дасягненні, якія неабходна будзе працягваць і ўмацоўваць.

Хочацца выказаць словы шчырай падзякі за ваш унёсак у справу развіцця нацыянальнай культуры, нястомны пошук шляхоў да яе абнаўлення і развіцця, за прэзентацыю нашай краіны на высокім узроўні па-за яе межамі. Прычым годны ўнёсак тут робіць як сталае пакаленне таленавітых майстроў, так і крэатыўная моладзь.

Няхай 2016-ы — Год культуры — адкрые новыя перспектывы і дазволіць увасобіць самыя запаветныя мары, будзе шчодрым на цікавыя праекты і творчыя адкрыцці. Ад усёй душы жадаю, каб надыходзячы год стаў годам стварэння, дабрыні, прыгажосці і творчых поспехаў!

Са святам, дарагія сябры! Моцнага вам здароўя, асабістага шчасця, дабрабыту і далейшай плённай дзейнасці на карысць роднай Беларусі!

**З павагай,
Міністр культуры
Рэспублікі Беларусь
Барыс СВЯТЛОЎ**



Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — члены Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы сардэчна віншуюць работнікаў культуры, дзеячаў мастацтваў, рэдакцыйны калектыў і чытачоў газеты "Культура" з Калядамі і Новым 2016 годам!

Спадзяёмся, што гэтыя цудоўныя святы будуць для кожнага з вас шчаслівымі і шчодрымі на разуменне, цеплыню і любоў. Выказваем вам глыбокую ўдзячнасць за прафесіяналізм, майстэрства, шчырую адданасць беларускай культуры, за тое, што дзякуючы вам наша жыццё становіцца больш змястоўным і прыгожым.

Ад усёй душы жадаем, каб у наступным годзе спраўдзіліся вашы самыя светлыя і жаданыя спадзяванні на лепшае. Моцнага вам здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Аляксандр СЯГОДНІК,
старшыня камісіі**

# Беларускі народны каляндар на 2016 год



*(Працяг. Пачатак на старонцы 1.)*

## Сакавік

**4. пт.** *Дзедава пятніца. Казімір. "Святы Казімір дровы сякуць".

**5. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** "Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі".

**6. н. *Рабы тыдзень, Малая вясельніца, Развітальны, Сырапусны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленным тыдні, у той дзень ад Іллі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі "калодкі" нежанатым хлопцам.

**9. с. *Лысая серада.** Праталіны-залысіны. **Янка, Паўрацэнне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

**10. ч. *Блакітны чацвер.** Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. "На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі".

**12. сб. Рыгор.** "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора".

**13. н. *Масленіца.** "Масленіца ў "вятху" (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку". ***Гуканне вясны.** "Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці". На Палессі вадзілі карагоды, "спявалі чырачку", наслалі ёлку з вянком. **Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

**14. пн. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю. **Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** "На Аўдокі голы бокі". (1.03 Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль).

**15. а. Хвядот.** "На Хвядота занос — усё сена знясе".

**16. с. *Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскаквалі цераз пень.

**17. ч.** Вясновае раўнадзенства. Усход сонца — 7.17, захад — 19.18. **Герасім Гракоўнік.** "Герасім гракоў прыгнаў".

**19. сб. *Зборава субота.** Абрад "споведзі дзежкі". **Язэп.** "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту". "На Язэпа пагода — год ураджайны".

**29. а. * Пальмова нядзеля.** "Вярба б'е, не я б'ю". ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года/лета ў час прыняцця юліянскага летазлічэння. Пачатак збору ў поле. "А святы Ізбор — бяжыць вада з гор".

**22. а. Саракі.** Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". **Прыска.** "На святога Прыску праб'е лёд і пліска".

**25. пт. Рыгор.** "На Рыгора зіма ідзе ў мора". **Дабравешчанне, Звеставанне.** "І птушка гнязда не кладзе". Прылёт бусла. Гуканне вясны.

**26. сб. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на "запасванне" кароў.

**27. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ** (у каталікоў). **Арына.** "На Арыну сей капусту ў расаднікаў".

**30. с. Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а борнік на хвою".

## Красавік

**1. пт. Дар'я Вясення.** Адбельвалі палотны.

**4. п.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі "храсты". Засеўкі. Абрад "жаніцьбы коміна".

**6. с.** *Серадапосце. Выпякалі "храсты". **Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі "буслявы лапы".

**7. ч. Благавешчанне.** "Благавешчанне без ластавак — халоднае лета". Абрад "Страла".

**8. пт. Благуста.** "На Благусту сей капусту".

**9. сб. Матрона.** "На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае".

**11. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** "Дзікая качка яйцом пахваліцца".

**14. ч. Прабуджэнне хатніка. Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

**15. пт. *Пахвальная пятніца.** Мыцці дзежак. **Палікарп.** Пачатак бясхлебіцы.

**16. сб. *Пахвальная субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў. **Мікіта.** "Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам".

**18. п.** Пачатак ***Вербнага тыдня.**

**21. ч. Руф.** Руф рушыць снягі.

**23. сб. Юры.** (Новы год па задыяку). "Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на "голы" лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла". **Войцах.** "Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху".

**24. н. *Вербніца. Анціп** — ахоўнік зубоў.

**25. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце. **Марк.** "Дождж на Марка, дык зямля як шкварка".

**26.а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і "гаўядо" не напала "парша", трэба ўсё мыць.

**27. с. *Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае.

**28. ч. *Чысты чацвер.** Лазня. Абрад мыцця дзежкі. **Пуд.** "Пуд снег пугне".

**29. пт. *Чырвоная, Вялікодная, пятніца.** Сеялі гарох. **Арына.** "На Арыну сей капусту".

**30. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. **Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## Май

**1. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ** (у праваслаўных). "Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!". **Кузьма.** "Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гуркам".

**2. п.** Працяг ***Велікоднага тыдня.** "Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць". Свята сена (Тураўшчына).

**4. с. *Градавая серада. Праводны Мёртвы, тыдзень.** "Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула".

**5. ч. *Ушэсце.** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. **Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады.

**6. пт. Юр'е.** Свята жывёлы. "Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня". Абрад "Страла".

**7. сб. Алісей.** "Прыйшоў Алісей — авёс пасей". **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

**8. н. *Праводная нядзеля.** "Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла". **Марк.** "Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка". **Станіслаў.** "Сей лён на Станіслава — вырасце як лава".

**9. п. *Радаўнічная Дзяды.**

**10. а. *Радаўніца.** "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць". **Ярылавіца.** Свята Ярылы.

**13. пт. Якуб.** "На Якуба грэе люба".

**14. сб. Макарэй.** Абрады ля вады.

**15. н. *Сёмуха, Зыход Св. Духа.** Свята зелені. **Барыс.** Апякун поля і жывёлы.

**18. с. Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

**20. пт. Антоній.** "На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца".

**21. сб. Іван Веснавы.** Апякун земляроба. "На Івана калосак, а на Пятра піражок".

**22. н. *Міраносцы.** "На Міраносця п'яны бабы цігаюць адна адну за валосся". **Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. **Алена.** "Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена".

**23. п.** Пачатак ***Пераплаўнага Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Зілот.** "Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злата".

**24. а. Макей.** "Мокра на Макея — і лета не прасушыць". **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

**25. с. *Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу. **Епіфан.** "На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета".

26. ч. *Божае цела, Зялёнок.

**27. пт. Сідары.** "Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы".

**28. сб. Пахом.** "Святы Пахом павее цяплом". "Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом".

**29. н. Магдалена.** Зязюльку прысылае.

**30. п. 31. а. Шэсць дзеў.** "Лён сей позні". **Канапелька Матруна.** "У зямлю махнула". **Фядот.** "Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка".

## Чэрвень

**2. ч. Тры пакутнікі.** "Няма лета, але пасля іх не бывае зімы".

**3. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень. Алена, Ульяна.** Дзень ільну.

**4. сб. Васіліск.** "Ад Васіліска і салавей блізка".

**5. н. Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі пакланіцца і абракацца.

**7. а. Ян.** "Рой перад Янам — пчаляр панам".

**9. ч. *Ушэсце.** Абрад "Страла".

**13. п. Ерамей. Антоній.** "Антоні, аддай коні".

**14. а. Юстын і Харытон.** "Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён".

**15. с. *Градавая серада.**

**16. а. Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

**18. сб. *Сёмушныя Дзяды. Духавая субота, Зялёная субота.**

**19. н. *Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і расліннасці. "Павядзём Куста пад гай зялёненькі...".

**20. п.*Святы дух.** "На Духа будзе цёпла і суха". **Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. "На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...".

Летняе сонцастаянне (з 17.06 да 23). Даўжыня дня — 17.07. Усход сонца — 4.38, захад — 21.45.

**21. а. *Конскі Вялікдзень.** Свята коней. **Тодар.** "На Тодара раса — канапель паласа".

**22. с. *Градабой, Серада Русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь. **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

**23. ч. *Наўская Тройца.** Памінанне. **Абліваха. Купала.** У старажытн. — Новы год/лета.

**24. пт. Ян Купальны.** "Сонца грае".

**25. сб. Анапрэй.** "Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ".

**26. н. *Русальчыны розгры.** Засцерагаліся рос. **Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.**

**27. п. *Пятроўка** да 11 ліп. Пятроўскі пост. Пятроўка-галадоўка.

**28. а. Амос.** "Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс".

**29. с. Ціхан.** "Пеўчыя птушкі заціхаюць". **Пятрок.** "Да Пятра зязюльцы кукаваці". "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два".

**30. ч. *Дзявятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе. "Дзеўчаць ягодзін на ветцы".

**Падрыхтаваў
Алесь ЛОЗКА, фальклярыст**

Закончэнне народнага календара — **у адным з наступных нумароў.**

## На людным месцы

**Гродна / Падарункі ад святога Мікалая**

**Штогод Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі ладзіць выставы, прысвечаныя Раству Хрыстову.**

Сёлетняя — "У чаканні цуда Раства Хрыстова" — прысвечана шляхецкім і народным традыцыям святкавання Раства, што панавалі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў. На выставе можна ўбачыць ёлачныя цацкі, абразы, кнігі са збораў музея, пачуць прыгожыя паданні аб узнікненні традыцыі аздабляць лясную прыгажуню, атрымаць падарункі ад святога Мікалая.

Асаблівую цікавасць выклікаюць экспанаты народнага лялечнага тэатра — батлейкі. Лялькі — персанажы дзеяў (валхвы, пастушкі) — нагадваюць наведвальнікам евангельскія сюжэты. Побач — музычныя інструменты (цымбалы, дудка, гармонік), якія маглі суправаджаць дзейства.

Своеасаблівай "разыначкай" выставы з'яўляецца арыгінальнае святочнае дзіцячае адзенне эпохі мадэрна з калекцыі Музея гісторыі моды Марыны Івановай (Кіеў).

У апошнія гады добрай музейнай традыцыяй стала правядзенне ў калядныя дні сумесна з хатнім тэатрам "Мар'я-ўмеліца" музычна-забаўляльных прадстаўленняў. Сёлета наведвальнікі ўбачаць спектакль "Каляднае падарожжа вакол свету".

**Астравеччына / Пагуляцца з вершамі**

**Вучні другога класа паўдзельнічалі ў літаратурнай гадзіне Варонскай сельскай бібліятэкі Астравецкага раёна "Яе любоўю і клопат — дзеці" (да 80-годдзя з дня нараджэння літаратара Ніны Галіноўскай). Кніжная паліца "Вершы, казкі, небыліцы" дапоўніла імпрэзу.**

Мэта мерапрыемства — знаёмства дзяцей з беларускай паэткай, яе творчасцю, заахвочванне цікавасці да чытання вершаў на беларускай мове, выхаванне любові да роднай краіны. Бібліятэкар Марыя Вішнеўская паведаміла дзецям аб жыцці паэткі, затым пазнаёміла з яе творчасцю. Параіла яна тым, хто захоча пабываць у казачным замку ці ў звярынцы, даведацца пра камп'ютарныя сакрэты, абавязкова звярнуцца да кнігі "Калі я шчаслівы". Парэкамендавала для знаёмства і цудоўную кнігу "Звяры ў трамваі" з вершамі, поўнымі весялосці і гарэзлівага гумару, ды з маляўнічымі ілюстрацыямі Аксаны Аракчэевай.

**Ганна КЕРЭЛЬ,
бібліятэкар аддзела
бібліятэчнага маркетынгу
Астравецкай раённай
бібліятэкі**

Закончэнне матэрыялаў рубрыкі — **на старонцы 15.**

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Галоўны рэдактар** — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Галіна МАХНАЧ.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункта гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2015. Наклад 5 533. Індэксы 63875, 638752. Розны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 30.12.2015 у 16.00. Замова 50. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

## С·Т·У·Д·З·Е·Н·Ь



Настася Сакалоўская. «Азбука». Аловак, 2010 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

КУЛЬТУРА
№ 1 / 2 студзеня 2016 г. / 4
Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

## Л·Ю·Т·Ы



Вера Ягоўдзік. Ілюстрацыя да кнігі Вальжыны Морт. Змяшаная тэхніка, 2011 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | | | | | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).



Марыя Дарожка. «Львоў». Лінарыт, 2011 г.

# 2016

## С·А·К·А·В·І·К

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

# К·Р·А·С·А·В·І·К



Яна Аляксеева. «Хроніка блукаючага тэатра». Каляровы афорт, 2003 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

# М·А·Й



Сяргей Шаўчэнка. «Танец поўдня». Літаграфія, 2006 г.

| Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).



Марына Мароз. «Ахоўнікі дрэў». Літаграфія, 2008 г.

# 2016

## Ч·Э·Р·В·Е·Н·Ь

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

## Л·І·П·Е·Н·Ь



Марына Юрчык. «Далягляды». Літаграфія, 2006 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

## Ж•Н•І•В•Е•Н•Ь



Кацярына Дубовік. Ілюстрацыя да «Шахматнай навэлы» Стэфана Цвэйга. Змяшаная тэхніка, 2013 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).



Алена Тукач. «Гара, якая спіць». Лінатып, 2010 г.

# 2016

## В·Е·Р·А·С·Е·Н·Ь

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

# К·А·С·Т·Р·Ы·Ч·Н·І·К



Таццяна Ржэвуцкая. «Там, дзе Нёман на Захадзе помніць варожую кроў». Літаграфія, 2010 г.

| Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

№ 1 / 2 студзеня 2016 г / 13

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).



Зося Піскун. «Адлюстраванне». Афорт, 2006 г.

# 2016

## Л·І·С·Т·А·П·А·Д

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

№ 1 / 2 студзеня 2016 г. / 14

КУЛЬТУРА

Падпісныя індэксы:
індывідуальны (63875)
і ведамасны (638752).

# 2016

## С·Н·Е·Ж·А·Н·Ь





Марына Жвірбля. «Камяні і кветкі», «Успамін». Афорт, 2014 г.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 2.)

## Віцебск /
### Гарбата з Несцеркам

**Работнікі Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра запрасілі ў госці да Несцеркі дзяцей і іх бацькоў, што завіталі 22 снежня ў Віцебск з Вялікіх Лук на расійскай Пскоўшчыне.**

Культработнікі арганізавалі для сяброў забаўляльную праграму, якая ўключыла сустрэчу з нацыянальнымі і казачнымі героямі — Паўлінкай і Несцеркам, Лявоніхай і Сымоніхай, Бабай Ягой, Дзедам Марозам, Снягуркай ды іншымі. Героі навагодняй праграмы правялі гульні, майстар-клас па побытавых танцах, экскурсію па выставе навагодніх і калядных сувеніраў "Зімовыя дзівосы", а таксама пачаставалі гарбатай.

**Андрэй СТРУНЧАНКА,**
**вядучы метадыст Віцебскага АМЦНТ**


Удзельнікі святочнай праграмы ў Віцебску.

## Зэльвеншчына /
### Ішла каза рагатая...

**Ёсць у Калядах штосьці адмысловае. Мімаволі згадваюцца ўспаміны з дзяцінства: бабулін аповед пра нараджэнне Хрыста, 12 страў на стале, падарункі, гульні, абрад калядавання…**

Тэрмін "Каляды" на Зэльвеншчыне аб'ядноўвае некалькі ўзаемазвязаных паняццяў: святочная дата, абрадавая страва — куцця, гурт калядоўшчыкаў, калядныя песні, пачастункі калядоўшчыкам ад гаспадароў, сена, што пасцілаюць на стол на Куццю. Можна смела казаць, што Каляды — свята моладзі, якая спрабуе вызначыць свой лёс, свята, якое перапоўнена гульнямі, звычаямі, варажбой, прыкметамі. Найбольшае пашырэнне сярод беларускага насельніцтва раёна меў абрад "ваджэнне казы". Хлопцы бралі кажух, выварочвалі поўсцю наверх, рабілі рожкі, прывязвалі саламяны хвост. Выбіралі здольнага да танцаў жартаўніка, ён залазіў пад кажух і цягам вечара выконваў ролю "казы". Суправаджаў "казу" другі хлопец, пераапрануты ў дзеда: яму рабілі горб, льняную бараду, апраналі драную світку, маску, у адну руку давалі кій, у другую табакерку. У кампаніі калядоўшчыкаў былі механоша, музыка, "цыган", "мядзведзь", "маладзіца". Усе разам заходзілі ў двор і прасілі дазволу калядаваць.

Сучасныя калядныя гурты ўдзельнікаў калектываў аматарскай творчасці і супрацоўнікаў Князеўскага сектара па арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці традыцыйна робяць абход двароў з віншаваннямі гаспадароў, выкананнем калядных і святых песень 26 снежня, таму што асноўная частка насельніцтва зоны абслугоўвання — каталікі.

7 студзеня праходзіць калядны абрад у аграгарадках "Дзярэчын", "Бародзічы", "Караліно", "Славацічы", "Крывічы", "Галынка", вёсцы Чырвонае сяло, а ў аграгарадку "Кашалі" шчадруюць 13 студзеня.

Больш за дваццаць гадоў, як работнікі Раённага дома культуры адрадзілі традыцыю калядавання і ў гарадскім пасёлку Зэльва. Некалькі гуртоў, адкалядаваўшы, збіраюцца на цэнтральнай плошчы і паказваюць жыхарам і гасцям пасёлка тэатралізаваную дзею з "казой", "цыганкай", "мядзведзем", з песнямі, пажаданнямі, гульнямі. Калядны абрад трывала ўвайшоў у жыццё зэльвенцаў. І нават дзеці ды падлеткі самастойна арганізуюць гурты з пераапрананнямі, ходзяць калядаваць.

**Алена ЛАМЕКА,**
**загадчык аддзела па развіцці народнай творчасці Зэльвенскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці**


Падчас вечарыны ў Музеі гісторыі рэлігіі ў Гродна.


Літаратурная гадзіна ў Варонскай сельскай бібліятэцы.

## Малдова /
### Беларуская фарба

**Бюро міжэтнічных зносін Рэспублікі Малдова адзначыла чвэрць стагоддзя з дня стварэння ў Нацыянальным тэатры імя Міхая Емінеску.**

Гэта пастаянна дзеючы орган пры Урадзе Малдовы, які ўзаемадзейнічае з нацыянальнымі меншасцямі, працуе на захаванне, развіццё і выяўленне этнічнай, культурнай, моўнай і рэлігійнай самабытнасці, супрацоўнічае з этнакультурнымі няўрадавымі арганізацыямі.

Адным з дзейсных механізмаў абароны інтарэсаў нацыянальных меншасцей з'яўляецца Каардынацыйны Савет этнакультурных арганізацый пры Бюро міжэтнічных зносін Рэспублікі Малдова, які таксама адзначыў 20-годзе з дня заснавання. У склад Савета ўваходзяць кіраўнікі акрэдытаваных грамадскіх аб'яднанняў, якіх па стане на верасень 2015 года налічвалася 93. Інтарэсы ж беларусаў, якія пражываюць на малдаўскай зямлі, прадстаўляюць два этнакультурныя аб'яднанні, і сярод іх — Беларускі культурны рух Малдовы.

Святкаванні ўгодкаў Бюро міжэтнічных зносін пачаліся яшчэ ў канцы кастрычніка фестывалем мастацтваў "Plai natal" ("Родны край"). Беларускі культурны рух Малдовы на выставе "Культурная спадчына" прэзентаваў інфармацыйны стэнд аб духоўным і творчым багацці беларускай зямлі. Дэманстравалася літаратура аб традыцыях, звычаях, гісторыі і мастацтве Беларусі, а таксама — інфармацыя турыстычнага характару. На агляд публікі былі прадстаўлены карціны, фатаграфіі і творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

На юбілейным святкаванні годна прагучала беларуская мова. Паэтычна-музычная замалёўка "Мая Беларусь" беларуска-малдаўскага этнічнага тэатра "Куфар" (створаны пры Беларускім культурным руху Малдовы) складалася з паэзіі Янкі Купалы, Петруся Броўкі…

**Ганна МАЗУР,**
**старшыня праўлення Беларускага культурнага руху Малдовы**


Прадстаўнікі беларускай грамады ў Кішынёве.

## Мёршчына / Два бібліятэчныя лёсы

**Настасся Драба і Вольга Арцімовіч — перспектыўныя, ініцыятыўныя супрацоўнікі Цэнтральнай раённай бібліятэкі. Паспелі найлепшым чынам сябе зарэкамендаваць, хоць працуюць са жніўня.**

Дзяўчаты — маладыя спецыялісты, скончылі Універсітэт культуры і мастацтваў. Поўныя разваг і клопатаў пра будучыню. Абедзве — мярчанкі. Праўда, Насця з Клётавага Двара, але гэта амаль што побач з райцэнтрам. У школе яна не мела канкрэтнай мары пра пэўную прафесію. Універсітэт культуры і мастацтваў спадабаўся звонку, вось і наважылася звязаць з ім лёс. Прапанавалі інтэрнат. Вучылася дзяўчына добра: атрымлівала ад сямі балаў і вышэй. Спасцігала ж Насця спецыялізацыю абслугоўвання дзяцей і юнацтва, падбірала літаратуру, назапашвала псіхалагічныя веды. Цяпер дзяўчына працуе ў аддзеле камплектавання. Як і іншыя спецыялісты, узаемадзейнічае наўпрост з выдавецтвамі, па прапанаваных прэйскурантах выбірае выданні: і таннейшыя, і больш дарагія. Замужам, выхоўвае дачушку Ганначку.

Вольга Арцімовіч трапіла ў БДУКіМ на скарочнае чатырохгадовае навучанне. Чаму абрала такую прафесію? Заўсёды падабаліся літаратура і гісторыя. Спачатку сабралася ў магілёўскі каледж, але ўрэшце вырашыла "штурмаваць" сталічную вышэйшую ўстанову. У дадатак да бібліяграфіі мае спецыялізацыю па краязнаўстве. Цікавяць асаблівасці гербаў, мясцовыя дыялекты, супадзенне тапонімаў. Сапраўды, Гомель — і абласны цэнтр, і аграгарадок пад Полацкам, а Новы Пагост ёсць на Брэстчыне і ў нас. Падобных прыкладаў — безліч. Падчас вучобы Вольга практыкавалася ў сталічнай Прэзідэнцкай бібліятэцы. Зараз вучыцца кіраваць аўтамабілем. Пакуль не замужам, так што, хлопцы, ёсць падстава зазірнуць за кніжкай у Цэнтральную бібліятэку.

**Алена БАСІКІРСКАЯ**



Настасся Драба і Вольга Арцімовіч.

## Дзятлаўшчына /
### "Пакінь мышку! Вазьмі кніжку!"

**Культурным цэнтрам аграгарадка "Дварэц" Дзятлаўскага раёна з'яўляецца наша сельская бібліятэка. У рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка—асяродак нацыянальнай культуры" яна атрымала ў намінацыі "За падтрымку і развіццё чытання" дыплом III ступені.**

Адметнай з'явай у жыцці ўстановы з'яўляецца штогадовая акцыя "Кніга 103". Яе мэта — прыцягненне новых чытачоў, папулярызацыя чытання сярод дзяцей, юнацтва і сталых людзей. У акцыі прымаюць удзел як бібліятэчныя адмыслоўцы, так і добраахвотныя памагатыя — актыўныя чытачы. Падчас акцыі жыхары вёсак знаёмяцца з выставай навінак літаратуры, могуць узяць цікавыя кнігі. Распаўсюджвалася разнастайная друкаваная прадукцыя, візітоўкі са слоганамі "Пакінь мышку! Вазьмі кніжку!", "Ствары сваю будучыню — чытай!", закладкі, лістоўкі з запрашэннем наведаць бібліятэку.

"Кніга павінна выйсці насустрач людзям" — такі наш дэвіз. Ля сваёй установы ладзім "бібліятэку пад парасонам". Праводзім рэкламную акцыю "Дзень добры, будучы чытач!".

Мерапрыемства "Лета з кнігай на палянцы" прайшло на прыродзе і прысвечана было кнігам пра лета.

**Алена КАЗЛОВА,**
**бібліятэкар II катэгорыі Дварэцкай сельскай бібліятэкі**



Матэрыялы да конкурсу з аграгарадка "Дварэц".

## Ганцавічы /
### Дарога да храма

**Супрацоўнікі Ганцавіцкай раённай дзіцячай бібліятэкі сістэмна займаюцца духоўна-эстэтычным выхаваннем юных чытачоў. Тут дзейнічае праваслаўны куток "Духоўнасць. Вера. Вечнасць", дзе праходзяць гадзіны духоўнасці, ладзяцца сустрэчы з праваслаўнымі вернікамі і святарамі, адбываюцца прэзентацыі кніг, дэманструюцца мультымедыйныя паказы.**

Частым госцем мерапрыемстваў стала кіраўнік нядзельнай школы Свята-Ціханоўскага храма Марыя Орса. Работа вядзецца і па-за сценамі ўстановы. Бібліятэка прыняла ўдзел у пасяджэнні на тэму "Князь Уладзімір. Цывілізацыйны выбар Русі" ў рамках святкавання ўгодкаў святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. У гарадскім Доме культуры збіраецца поўная зала дзятвы, каб паглядзець выступленні тэатра кнігі "Бураціна" і ўзорнага лялечнага тэатра "Усмешка", якія працуюць пры бібліятэцы.

На пачатку снежня супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэчнай сістэмы прынялі ўдзел у Калядных чытаннях "Духоўная спадчына святога князя Уладзіміра ў перспектыве развіцця Беларусі". На пасяджэнні дырэктар бібліятэчнай сістэмы Ала Хваль выступіла з дакладам "Праваслаўнае краязнаўства бібліятэк Ганцавіччыны як крыніца вывучэння гісторыі роднага краю". Яна распавяла пра ўнікальныя дакументальныя матэрыялы, якія былі сабраны бібліятэкарамі раёна па гісторыі праваслаўя на Ганцавіччыне.

**Тацццяна МАЛЯЎКА,**
**загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай РЦБС**



Работнікі Ганцавіцкай РДБ.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20.*
*Тэл.: 327 45 62.*
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі адкрылася выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.
Выставы:
■ Выстава твораў Мікалая Залознага **"Колер жыцця"** да 90-годдзя з дня нараджэння мастака — да 11 студзеня.
■ Выстава твораў Васіля Зянько **"Архіварыус"** — да 11 студзеня.
■ Выстава жывапісу **Рамана Заслонава** — да 25 студзеня.
■ Выстава жывапісу **Мацвея Басава** — да 11 студзеня.
■ Выстава **"Рэпліка. Керамапластыка Валерыя Калтыгіна"** — да 18 студзеня.
■ Выстава **"Гоя... Пікаса"** (графіка са збору Каралеўскай акадэміі прыгожых мастацтваў (Мадрыд, Іспанія)).
■ Выстава **"Джэнтльменскі набор"** — да 25 студзеня.

*Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь*

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенцця Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
Выстава:
■ **Калядная выстава Валянціны Шоба**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Івянецкая школа керамікі: традыцыі і сучаснасць"** — да 9 студзеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.*
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выставы:
■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шляхах гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ **"Музей ёлачных цацак"** — да 17 студзеня.
■ Выстава аўтарскай лялькі **"Спадарыня Лялька. Залюстэрчча"** — да 10 студзеня.
■ Выстава твораў Алега Карповіча **"Свет вачыма мастака"** — да 3 студзеня.
Акцыя:
■ Навагодняя анімацыйная праграма **"Калядныя прыгоды ў Гістарычным музеі"** — 4 і 5 студзеня а 10-й і ў 17.30.

*Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь*

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП
*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
Выстава:
■ Выстава твораў омскага майстра мікрамініяцюры Анатоля Каненкі **"Цуд пад мікраскопам"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.*
Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
Выстава:
■ **"Джунглі за шклом"** — да 6 сакавіка.

*г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.*
■ Выстава **"Мумії свету"** — да 17 студзеня.

*г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.*
■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 17 студзеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
*г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
Выстава:
■ Выстава твораў — удзельнікаў конкурсу **"Калядныя замалёўкі"**.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
*г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
Выстава:
■ **"Ледзяныя карункі"** (работы навучэнцаў Акадэміі творчасці "TALENT") — да 9 студзеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
*г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.*
Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
Выстава:
■ Выстава калядная і навагодняй паштоўкі **"Папяровы цуд на Каляды"**, падрыхтаваная сумесна з Беларускім саюзам дызайнераў, — да 10 студзеня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92.*
*Музей працуе:*
*пн. — выхадны,*
*аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,*
*ср. — ад 12-й да 20-й.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
Акцыі:
■ **"Навагодняя партызанская пошта"** — да 14 студзеня (акрамя 7 студзеня).
■ Пазнавальна-забаўляльная праграма **з партызанскім Дзедам Марозам** — 2 і 3 студзеня ад 13-й да 17-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.*
*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Вялікі баль у палацы Радзівілаў"** — да 31 студзеня.
■ Выстава **"Спяшаюся павіншаваць Вас..."** — да 8 лютага.
*Ратуша*
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Чорна-белыя вандроўкі Барыса Бокшы"** — да 15 студзеня.
■ Выстава **"Літва і Беларусь на старонках сямейнага альбома княжны Марыі Гагенлоэ"** — да 17 студзеня.
■ Выстава ўзнагарод алімпійскага чэмпіёна Максіма Мірнага **"Мірныя трафеі"** — да 15 студзеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.*
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).
■ Праект **"Зімнія канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэдняй дамоўленасці) — да 6 студзеня.
Выставы:
■ Выстава твораў Аляксандра Каршакевіча **"Усмешкі з добраю душой"** — да 16 студзеня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
*г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.*
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя
**"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ **"Калядкі ў Купалавым доме"** (па папярэдняй дамоўленасці) — да 5 студзеня (акрамя 2 і 3 студзеня).

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
*г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*

*Філіялы Музея гісторыі горада Мінска*

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
*г. Мінск, ул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
Выстава:
■ **"Прастора Суціна"** (творчыя вынікі ўдзельнікаў аднайменнага міжнароднага жывапіснага пленэра ў вёсцы Засвір Мінскай вобласці) — да 14 студзеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
*г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
Выставы:
■ Выстава **"Машыны, якія гавораць / Talking machine"**, пры ўдзеле творчай групы "Рамзэс Экспа" — да 27 сакавіка.
■ Выстава жывапісу Віктара Маркаўца **"Заслаўе. Жывапісныя імпрэсіі старога горада"** — да 10 студзеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
*г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
Выстава:
■ Выстава графікі і скульптуры Уладзміра Даўгялы і Сяргея Аганава **"Гонар. Годнасць"** — да 31 студзеня.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.*
Экспазіцыі:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ "Народныя іконы Беларусі 2-й пал. XIX ст.".

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.*
■ Выстава-рэканструкцыя **"Прыцемкі Сярэднявечча. Прылады пакарання"** — да 31 студзеня.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЕСТА"
*г. Мінск, ул. Герцэна, 2а. Тэл.: 321 24 30.*
■ Выстава **"Гармонія кантрастаў"** (работы мастакоў творчага аб'яднання "Арцель" Рыгора і Наталлі Івановых) — да 10 студзеня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
*г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*
*Цэнтральная частка палаца*
Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
Выставы:
■ Інтэрактыўны выставачны праект **"У гасцях у казкі"** — да 14 лютага.
■ **"Новае ў археалогіі Гомельшчыны"** (новыя знаходкі з Мохаўскай і Гомельскай археалагічных экспедыцый пад кіраўніцтвам А.А. Макушнікава) — да 1 лютага.
■ **"Баявыя шлемы і харугвы беларускіх земляў XI — XVII стст."** (выстава прадастаўлена мастацкай майстэрняй "Стальная Спадчына" (Мінск)) — да 14 лютага.
■ **"Акварэльная сюіта Надзеі Рэпінай"** — да 24 студзеня.
■ Выстава сувеніраў і падарункаў ручной работы **"Чароўныя падарункі"** — да 24 студзеня.
*Вежа палаца*
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

*Паўночнае крыло палаца*
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.
*Зімовы сад*
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.
*Белая гасцёўня*
■ **"З любоўю да класікі"** (канцэртная праграма пры ўдзеле лаўрэата міжнароднага конкурсу Канстанціна Гарошкі і Віталя Фаміна) — 9 студзеня а 17-й.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.*
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная чырвонай арміі першай паловы XX стагоддзя, з фондаў музея.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
*г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.*
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
Выставы:
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстава да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы пабыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Музейна-вобразная зала **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстава **"Тры плюс ART"**.
■ Выстава **"Ад пяра гусінага да камп'ютара сучаснага"**.
■ Выстава **"Чароўны куфар"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
*г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.*
■ Выстава **"Геніны гены"** (творы Генадзя Хацкевіча, а таксама яго дзяцей Аляксея і Мадлен і ўнукаў Ганны і Пятра) — да 16 студзеня.

УВАГА! / ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

**Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"** звяртайцеся па тэлефоне **+ 375 17 286 07 97** і па тэлефоне/факсе **+375 17 334 57 41**, альбо пісьмова на электронны адрас **kultura@tut.by!**

ТЭАТРЫ

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.*
■ **2 студзеня — "Травіята"** Дж. Вердзі.
■ **2 — "Партрэты. Леанід Уцёсаў і Эдзіт Уцёсава"** (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **3 — "Цэрам-Цэрамок"** (опера ў 2-х дзеях) І.Польскага. Пачатак а 12-й.
■ **3 — "Сільфіда"** (балет у 2-х дзеях) Х.Левенсхольда.
■ **5 — "Яўгеній Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **6, 8 — "Доктар Айбаліт"** (прэм'ера оперы ў 2-х дзеях) М.Марозава. Пачатак а 12-й.
■ **6, 8 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **9 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.-А. Моцарта.

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР**
*г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.*
■ **2 — "Марозка"** У.Баскіна. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
■ **2 — "Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча.
■ **3, 4, 5, 6 — "Снежная каралева"** Г.Шайдулава. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
■ **3 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **4 — "Юнона" і "Авось"** А.Рыбнікава.
■ **5 — "Бабскі бунт"** Я.Пціціна.
■ **8 — "Шэдэўры сусветнага класічнага балета"** — Гала-канцэрт.
■ **9 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** А.Хадоскі.

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"**
*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.*
■ **8 — "Адамавы жарты"** С.Навуменка.
■ **9 — "Любоў Людзей"** (прэм'ера) Д.Багаслаўскага

**БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"**
*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*
■ **2, 3, 8, 9 — "Таямніцы навагодняга лесу"**. Пачатак аб 11-й, 14-й (2, 3, 8, 9) і а 17-й (8).